**Інфармацыя для студэнтаў па рабоце з ЭВМК па дысцыпліне “Беларуская мова: прафесійная лексіка”**

ЭВМК па дысцыпліне “Беларуская мова: прафесійная лексіка” складаецца з некалькіх частак:

***1. Дакументы.***

***2. Заняткі па тэмах дысцыпліны.***

Кожны занятак утрымлівае:

- ✓ тэарэтычны матэрыял;
- ✓ практычныя заданні;
- ✓ уваходны тэставы кантроль (па папярэдняй тэме);
- ✓ тэставы кантроль па тэме бягучага занятку.

Уважліва чытайце матэрыял па кожнай тэме, старайцеся выбіраць галоўнае і пісаць канспект тэарэтычнай часткі, выконвайце практычныя заданні пісьмова ў сшытках – гэта дапаможа вам добра зразумець і трывала засвоіць атрыманую інфармацыю. Для праверкі засваення вамі неабходнага аб’ёму ведаў у канцы кожнай тэмы размешчаны тэст.

Абавязковай умовай для допуску да заліку з’яўляецца выкананне выніковага тэста, размешчанага ў заліковай частцы (Т. 17).

***3. Блок дадатковага кантролю ведаў*** змяшчае тэксты для перакладу, якія можна выкарыстоўваць у якасці адпрацовак прапушчаных заняткаў або для самастойнай работы (па рашэнні выкладчыка), і 2 варыянты кантрольных работ.

ЭВМК па беларускай мове змяшчае таксама прэзентацыі, якія дапамогуць вам пашырыць кругагляд і сістэматызаваць веды па некаторых найбольш аб’ёмных тэмах.

***4. Форум для зносін з выкладчыкам***.

Пры ўзнікненні цяжкасцей, звязаных з любой часткай тэмы, неадкладна звязвайцеся з выкладчыкам, які праводзіць у вас занятні па дысцыпліне, або выкладчыкам, які з’яўляецца стваральнікам дадзенага ЭВМК.

Займайцеся беларускай мовай кожны дзень! Паўтарайце вывучанае на занятку, трэніруйце вымаўленне, чытайце кнігі. Памятайце: каб авалодаць

мовай, на ёй трэба гаварыць. Размаўляйце па-беларуску ўсюды: з сябрамі, з выкладчыкамі, у краме, у кавярні, у паліклініцы, на вуліцы.

Жадаем вам поспехаў!

Шлях да ЭВМК “Беларуская мова: прафесійная лексіка” ў сістэме etest: http://etest.bsmu.by/course/view.php?id=69